5 Ис 3192

5Ис 3192

М. АНЦАЎ

# ЗАЙЧЫК-ГРАЙЧЫК



## ДЗІЦЯЧЫЯ ПЕСЬНІ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫ.
МЕНСК 1930

5 Мс 3192

М. В. АНЦАЎ

# ЗАЙЧЫК-ГРАЙЧЫК

40 БЕЛАРУСКІХ ПРЫГАВОРАК, ПРЫПЕВАК, КАЗАЧАК і НЕВЯЛІЧКІХ ПЕСЕНЕК ДЛЯ РАЗЬВІЦЬЦЯ РЫТМУ і СЛЫХУ Ў МАЛЕНЬКІХ ДЗЕТАК 3—7 ГАДОЎ

*Навукова-Мэтодолёгічным Камітэтам НКА БССР дапушчана як дапаможнік пры выкладаньні сьпеваў у дашкольных установах і першых клясах сямігадовых і чатырохгадовых школ*

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК 1930

БССР Імені Леніна
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

Вокладка
мастака
А. ВОЛКАВА

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва
Галоўлітбел № 1668. Тыраж 5000. Заказ № 288.

## 39. Май.
### (Песьня)

Allegretto

Словы Хмаркі



1. Шчыра сонца пазі-рае.
2. Кветкі, зелень, шчасьце, волю
3. Птушкі гнёзды ўюць, сьпяваюць.
4. Пойдзем, дзетка, ў луг зялёны,



Апрануўся ў лісьце гай Ўсё сьмяецца, ўсё сьпявае. Гэ-та май, пры-
ўсім нясе з са-бой вясна. Вабіць лес зя-лёны, ў полі песьня жаўран-
Ўсе вясёлы ў гэты час Шчыра ўсе вяс-ну ві-таюць і зва-рот я-
годзі спаць та-бе, ўставай! Шчаснай песьняй узбуджанай прыві-таем



го-жы май Ўсе сьмяецца, ўсе сьпявае Гэ-та май, пры-го-жы май.
ка чут-на Вабіць лес зя-лё-ны, ў полі песь-ня жаўран-ка чут-на.
е да нас. Шчыра ўсе вяс-ну вітаюць і зва-рот я-е да нас,.
сьветлы май. Шчаснай песьняй узбуджанай прывітаем сьветлы май!

# 40. Нашы птушкі.

(Песьня)

Словы А. Гурло

Poco allegretto



1 Ў на-шым краі Бе-ла-ру-сі
2 Кар-шу-ны, сі-ва-ва-рон-кі,
3 Дзят-лы, чы-жы-кі, зя-зю-лі,
4 Лас-таў-кі і ве-ра-бей-кі
5 Над ра-ка-мі на лу-жайках



ёсьць і качкі, бус-лы, гу-сі, і са-ро-кі,
і шчыг-лы і жа-ва-ронкі, гал-кі, крумка-
ку-лі-кі, сяў-цы, жаў-ну-лі, зяб-лы, шпа-кі,
і сі-ні-цы, са-ла-вей-кі, сой-кі, піг-лі-
ёсьць глуш-цы, чы-бі-сы, чай-кі, і вя-дуц-ца



і са-кол-кі, цаплі, со-вы, пе-ра-пёл-кі.
чы, ва-ро-ны, га-лу-боч-кі на-хах-лё-ны.
і ця-це-ры; ку-ра-пат-кі пер'ем шэ-ры.
цы, у-до-ты, што ля-та-юць без ах-во-ты.
на ба-ло-тах жу-раў-лі ў гу-стых ча-ро-тах.

# 1. Ладкі-ладушкі.

(Прыгаворка)

Народная

Moderato



# 2. Тадзей-дабрадзей.

(Прыгаворка)

Народная

Moderato assai




* * *

Тадзей-дабрадзей, забаўляй дзяцей!  
Ганяй птушачак з-пад макушачак.  
Не дзяўбі пясок і ня бегай наўскок.  
На дарозе пясок зьбірай у гаршчок.

# 3. А чы-чы, сарока!..

(Прыгаворка)

Народная

Moderato




* * *

А чы-чы, сарока,
Куды ляціш далёка?
Села, пала на таку
У чырвоным калпаку
І сакоча на суку:
„Буду я табе служыць,
На шнуры саху насіць".

# 4. Кот і мышка.

(Казачка)

Словы невядом аўтара




3. Кот вужакай круціцца,
Капцюры вон лупяцца…
З цёмнай норкі-дзюрачкі
Ля ката, ля мурачкі
Мышка паказалася,
Кругом азіралася.
Сьцеражыся, мышанька!
Будзе бяда-лішанька!…

4. Коціка ня бачачы,
Пайшла мышка скачучы…
Ой, бяда ўжо блізіцца,
Кот на лапкі нізіцца…
Вось маланкай коцік сьвіснуў,
Капцюрамі мышку сьціснуў…
„Муры, муры, муры“,—
Ладзіць кот хаўтуры.

# 5. Люлі-люлі-люлечкі!

(Прыгаворка)

Народная




* * *

Люлі, люлі, люлечкі!
Сяду, стану прасьці я.
І дзіцятка калыхаці.
Што выведу нітачку—
Камару на сьвітачку,
Астануцца кончыкі—
Камару на штончыкі.

# 6 Кую, кую ножку...

## (Прыгаворка)

Народная

Poco allegretto



# 7 Козьлік.
## (Казачка)

Словы Я. Журбы




2. Красачкі, траўку, лісьцікі рвала,
Козьліку часта ежу давала.
Ў сенцах на траўцы клаўся ён спаці,
Часта ў садочак бегаў гуляці.

3. Раз захацеў ён зьбегаць ў гаёчак:
Стаў яму цесны бабкін садочак.
Козьлік разбурыў тын у садочку—
І апынуўся ён у лясочку.

# 8. Ласачка.

## (Прыгаворка)

Народная

Moderato



# 9. Бім-бом
## (Прыгаворка)



# 10. Кветка

(Нібы прыгаворка)

Словы З. Бядулі (Ясакар)

Allegretto Giocoso




* * *

Зух-хлапчына, малайчына,
Ўвесь мядовы, каляровы,
Срыбрабокі, златабокі;
Валасочкі у пучочкі,
Сіні зубкі, жоўты губкі,
Стан цянюткі у малюткі.

Вясной, летам з хлопцам гэтым
Ўсе гуляюць, байкі баюць.
Яму роскі мыюць коскі,
Песьціць вочкі навакола матка-ночка,
Гудзяць пчолы,
Пяюць птушкі-лапатушкі.

# 11. Калыханка.

(Прыгаворка)

Народная



# 12. Вясенняя раніца.

(Верш)

Словы М. Чарота

Poco moderato Simplice.






БА 24387
Инв. 1953 г.
... Леніна

# 13. Коцік

(Прыгаворка)

Народная

Allegretto









## 14. Восень.

(Верш)

Словы Я. Журбы

*Moderato e tranquillo*







5 Ме 3192

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ


хо-лад к нам з са-бо-ю прыняс-ла. За-жу-рыў-ся гай шум-
лі-вы, дрэ-вы жа-ла-сна шу-мяць; на га-лін-ках, бы на
воч-ках, сьлёзы кро-пе-лек ві-сяць. Не шча-бе-чуць у-жо
бо-лей птушкі звон-кі-я ў па-лёх і ня лё-та-юць вя-сё-ла маты-
-лёчкі на лу-гох. Ня гу-ля-юць дзеткі ў вёс-цы, іх ня чут-на га-ла-;
mf
rit.
p




## 15. Лік.
### (Прыпеўка)

Народная




* * *

Раз-два—галава;
Тры-чатыры—прычапілі;
Пяць-шэсьць—дзе тут сесьць;
Сем-восем—сена косім;
Дзевяць-дзесяць—хустку вешаць.

# 16 Люлі-люлі, калышу.

(Прыпеўка)



# 17 Сарока.

(Прыпеўка)

Словы перакладныя




* * *

Сарока, сарока, дзе была далёка?
Кашу замінала, дзецi гадавала.
На парог скакала і гасьцей склiкала.
Госьцi пазналi, быць абяцалi.

# 18. Дождзжык.

(Прыпеўка)

Народная

Moderato



# 19. Пастушок.

(Прыпеўка)

Словы невяд аўтара






* * *

Раным-рана, чуць дзянёк, затрубіў наш пастушок:
Ту-ру, ту-ру, та-ра-ра! Затрубіў наш пастушок.
    На пяньку пастух сядзіць, а ўгары нешта гудзіць.
    Ту-ру, ту-ру, та-ра-ра! У гары нешта гудзіць.
Глянуў хлопчык ды аж сеў: самалётаў цэлых сем.
Ту-ру, ту-ру, та-ра-ра! Самалётаў цэлых сем.
    На іх лётнікі сядзяць, на маторы ўсё глядзяць.
    Ту-ру, ту-ру, та-ра-ра! На маторы ўсё глядзяць.
Я і сам як падрасту, з вамі разам паляту.
Ту-ру, ту-ру, та-ра-ра! З вамі разам паляту.

# 20 Ціп-ціп, курчаткі

(Песенька)

Словы апрац. В. Луцэвіч




2. Кач-кач-кач, гэй, качкі!
 Сюды падыходзьце
 І сваіх качатак хутчэй падводзьце!
 Я шмат для вас маю крупак парловых,
 Беленькіх, чысьценькіх, смачных, здаровых.
 Ква-ква-ква-ква!

3. Вуль-вуль-вуль, ну, гускі і гусяняткі!
 Для вас я прынесла аўса зярняткі.
 Рвацъ кіньце травіцу, ка мне сьпяшайце,
 Ня сыкайце гэтак, авёс зьядайце.
 Га-га-га-га-га-га!..

# 21. Зайчык-Грайчык.

(Песенька)

Словы З. Бядулі



# 22. Верабейчык.
## (Песенька)

Allegretto



# 23. Лісічка
## (Казачка)

Словы З. Бядулі

Moderato




2\. І даець ім булку з макам,
І даець ім шмат прысмакаў,
І даець ім цацкі-грайкі:
Талалайкі, балалайкі,
Тут і мышка паліўная,
Тут і котачка шкляная,
Тут і жабка з белай бляхі,
Тут і хаткі, тут і гмахі,
Змайстраваныя з паперак.

3\. Ёсьць і зайчыкі са стужак,
Ёсьць і кошычкі са стружак,
З жоўтай гліны чалавечкі,
Алавяныя авечкі.
Цацак шмат лісічка мае.
Колькі іх—сама ня знае.
Лічыць-лічыць, сьлепіць вочы,
Лічыць-лічыць, балабоча,
Па пясочку піша лапкай.

4\. Раптам зьнекуль скача жабка,
Гой! Ад лічбаў на пясочку
Ні круцёлкі, ні значочку.
Шурам-бурам разьляцеліс,
Невядома, дзе падзеліс.
Ліска блытае рахунак,
Кліча дзетак на ратунак.
Дзеці шчыра памагаюць,
Бо ўжо грамату ўсе знаюць.

# 24. Жалоблівы коцік.

Народная






# 25. Дзед-мароз.

(Песенька з 3-х гукаў)

Словы З. Бядулі

Poco moderato




2. Лес-лес, сьнег-сьнег...
Гэй, да хаткі на гару!
Гі-га! Сьмех-сьмех!
Дзеткі граюць. Конік тпру.
Конь-конь! Стой-стой!
Гэй, здароў, дзядок-мароз!
А й-ой, ой, ой!
Дзед гасьцінчыкі прывёз.

3. Тоўк-тоўк, мёд-мёд,
Цацкі, булкі і праснак,
Скок-скок, ход-ход!
Дзеткі скачуць гэтак-так:
„К нам, к нам, дзед, дзед!"
Зноў паехаў... Гулкі звон...
Зьнік-зьнік, сьлед-сьлед
На вакне пакінуў ён.

# 26. Раз-два

(Песенька з 4-х гукаў)

Пераклад В. Луцэвіч




* * *

Раз-два! раз-два! Ўсе у рад уважна!
Раз-два! раз-два! Сьмела і адважна!
Адбівайце такт нагой,
Як ваякі йдуць у бой.
Раз-два! раз-два! Сьмела і адважна!

Ціха! ціха! Ня шумець ні трошкі!
Ціха, ціха! Стаўце свае ножкі!
Навучайцесь так ступаць,
Каб мышкі ня спужаць.
Раз-два! раз-два! Як ваякі йдуць у бой.

# 27. Сьняжыначкі.

(Песенька з 4-х гукаў)

Словы З. Бядулі



# 28. Ягарачка.

(Песенька з 4-х гукаў)

Словы апрац. З. Бядуля



# 29. Козачка

(Песенька з 5 гукаў)

Словы апрац. Ясакар

Poco moderato



# 30 Дакушная песьня.




* * *

Йшоў я ды праз мост,—гэй, гэй, гэй!
На масьце варона сохне.
Ўзяў яе за хвост,—гэй, гэй, гэй!
Ды сьцягнуў пад мост,—гэй, гэй, гэй!
Хай яна там мокне,—гэй, гэй, гэй!
Йшоў назад праз мост,—гэй, гэй, гэй!
Пад мастом варона мокне.
Ўзяў яе за хвост,—гэй, гэй, гэй!
Выцягнуў на мост,—гэй, гэй, гэй!
Хай яна пасохне,—гэй, гэй, гэй!

# 31. Кветачкі.

(Песенька з 5 гукаў)

Словы З. Бядулі






* * *

А пад сонейкам, каля рэчанькі,
Каля гонейкі, быстрацечанькі,
Цьвітуць кветачкі ў цёпла летачка,
Цьвітуць красьненька, пахнуць смачненька;
Ї званочкамі, і лісточкамі,
Ї пянёчкамі, і кусточкамі
Ўсё ківаюцца, ўсё мільгаюцца.
Ї пад роскамі, і пад коскамі
Їх шаптушачкі-весялушачкі
Клічуць дзетачак-малалетачак.

# 32. Агарод

(Песенька 35 гукаў)

Словы А. Савёнак

Andantino



# 33. Ледзяная гара
(Песенька)



# 34. Загадкі і адгадкі.

(Нібы песенька)

Tempo ad libitum

Народная.









## 35. Жніво

(Песенька з 5-ці гукаў)

Словы А. Савёнак

Allegretto






У-се ра-зам, у-се разам прышлі жней-кі жыта жаць.
У-зя-лі з са-бой сяр-почкі, сталі жыта падразаць
У-се разам, у-се ра-зам сталі жы-та падра-заць.
У сна-поч-кі на-вя-за-лі трэба ў бабкі пастаў-ляць.
У-се ра-зам, у-се ра-зам, трэба ў баб-кі пастаў-ляць.




* * *

Расло жыта, расло ў полі, прышлі жнейкі жыта жаць.
Усе разам, усе разам прышлі жнейкі жыта жаць.
Узялі з сабой сярпочкі, сталі жыта падразаць.
Усе разам, усе разам сталі жыта падразаць.
У снапочкі навязалі, трэба ў бабкі пастаўляць.
Усе разам, усе разам, трэба ў бабкі пастаўляць.
Сонца сьвеціць, добра ў полі—будзем песенькі сьпяваць.
Усе разам, усе разам, будзем песенькі сьпяваць.
Хутка працу мы канчаем, пойдзем ўсе адпачываць.
Усе разам, усе разам, пойдзем ўсе адпачываць.

# 36. Восень.

(Песенька з 6 гукаў)

Словы Янкі Купалы



# 37. Пагудачка.

(Песенька з 6 гукаў)

Словы З. Бядулі



# 38. Шпак.
(Песенька)

Словы Я. Журбы



## ПРАДМОВА

Да апошніх часоў беларуская музычная літаратура, якая мае на мэце разьвіцьцё ў маленькіх дзетак рытмовага пачуцьця, а таксама і слыху, была, бязумоўна, вельмі бедная. У гэтай галіне, здаецца, мала хто працаваў. Аднак-жа, каб дзеці нашы былі музычныя і, каб гэту здольнасьць у іх добра разьвіць, трэба мець, зразумела, адпаведны для таго матэрыял, г. зн. **песьні, якія змогуць сьпяваць дзеці, а не такія, што магчыма пяяць дзецям.**

Аўтар спадзяецца, што невялікая яго ў гэтым сэнсе праца пад назвай **„Зайчык-грайчык“** будзе досыць карыснай як для сям'і, так і для розных дзіцячых садоў, першых груп школ і г. д.

Трэба помніць, што першапачатковае дзіцячае сьпяваньне — гэта нішто іншае, як несьвядомае лепятаньне, заснаванае выключна на перайманьні. З гэтага музычнага лепятаньня, пэўна, пачыналі ўсе славутыя музыкі, сьпевакі і кампозытары.

Музычнае выхаваньне дзіцяці, уласна кажучы, можна пачаць з самага раньняга ўзросту, амаль з калыскі, г. зн. дома, у сям'і. І ўсё гэта выхаваньне павінна быць угрунтавана на гукаперайманьні, бо яно мусіць быць выключна слыхавым.

Лепшым матэрыялам для слыхавога пяяньня, бязумоўна, зьяўляюцца прыгаворкі, або словы з мотывамі **рытмічнага** характару; апрача таго, прыпеўкі, казачкі і невялічкія песенькі або словы з мотывамі **мэлёдычнага** характару; як тыя, так і другія трэба дзецям раней выконваць голасам і са словамі, ня больш аднаго-двух тактаў. Частае паўтарэньне данага мотыву голасам з падыгрываньнем на якім-небудзь інструманце мімаволі прымусіць вывучыць мотыў напамяць.

Калі дзіцянё ня можа само паўтарыць тое, што чуе, або доўга ня можа схапіць мотыву ў адносінах да рытму, то карысна будзе адначасна з голасам выстукваць усе долі мотыву па плячы ці па руцэ дзіцяці; рабіць гэта трэба хаця і лёгкім, але энэргічным дотыкам паказальнага пальца.

Вось прыблізна якімі спосабамі трэба пачынаць слыхавое ці гукапераймальнае пяяньне з дзецьмі наймалодшага ўзросту. Сыстэма-

тычнае навучаньне музыцы трэба пачынаць прыблізна паміж 6—8 гадамі, г. зн. тады, калі дзіцянё чытае, піша і займаецца арытмэтыкай.

Прапанаваныя 40 нумароў гэтага сьпеўніка „Зайчык-грайчык“ напісаны для фортап'яна ў лёгкай апрацоўцы. Мотывы для выкананьня голасам асобным радком не напісаны. Для кожнага, хто навучае музыцы, ясна, што ўсе гэтыя мотывы—як рытмічныя, так і мэлёдычныя—бязупынна паўтараюцца або ў вышэйшым, або ў сярэднім, або ў ніжэйшым голасе. Адпаведна гэтаму і тэкст выпісваецца па тактах, а галоўны мотыў, апрача таго, асобна—у пачатку кожнага нумару.

Значыць, дзіцянё павінна раней усяго добра вывучыць пачатак вершу з асноўным або галоўным мотывам, а потым паступова ісьці далей. Усе мотывы трэба вучыць абавязкова разам з тэкстам. Бяз слоў дзеці мотыву хутка ня схопяць, бо іх у першую чаргу і галоўным чынам цікавяць словы—толькі словы. Музыка для дзяцей—гэта аздоба, якую яны хаця-ж і добра чуюць, але зразумеюць яе толькі напасьледку.

Пачынаць трэба з прыгаворак, г. зн. выключна з рытмічных мотываў, далей можна даваць прыпеўкі — мэлёдычныя мотывы з двух гукаў і больш і, нарэшце,—маленькія песенькі.

Увесь матэрыял прапанаванага сьпеўніка „Зайчык-грайчык“ разьмяркованы сыстэматычна і зьяўляецца ўступным аддзелам „Музычнай хрэстаматыі харавога пяяньня“, якая ў хуткім часе будзе надрукавана. Гукаперайманьне або слыхавое сьпяваньне — гэта падрыхтоўка для далейшага супольнага і разам з тым школьнага пяяньня.

Менск,
1930 г.

*М. А.*

## ЗЬМЕСТ


Стар.

Прадмова . . . . . . . . . 3
1. Ладкі-ладушкі . . . . . . . . 5
2. Тадзей-дабрадзей . . . . . . . 6
3. А чы-чы, сарока . . . . . . . 7
4. Кот і мышка . . . . . . . . 8
5. Люлі, люлі, люлечкі . . . . . . 9
6. Кую, кую ножку . . . . . . . 10
7. Козьлік . . . . . . . . . 11
8. Ласачка . . . . . . . . . 12
9. Бім-бом . . . . . . . . . 13
10. Кветка . . . . . . . . . 14
11. Калыханка . . . . . . . . 15
12. Вясеньняя раніца . . . . . . . 16
13. Коцік . . . . . . . . . 18
14. Восень . . . . . . . . . 19
15. Лік . . . . . . . . . . 21
16. Люлі-люлі, калышу! . . . . . . 22
17. Сарока . . . . . . . . . 23
18. Дожджык . . . . . . . . . 24
19. Пастушок . . . . . . . . . 25
20. Ціп-ціп, курчаткі . . . . . . . 27
21. Зайчык-грайчык . . . . . . . 28
22. Верабейчык . . . . . . . . 29
23. Лісічка . . . . . . . . . 30
24. Жалоблівы коцік . . . . . . . 31
25. Дзед-мароз . . . . . . . . 32
26. Раз-два . . . . . . . . . 33
27. Сьняжыначкі . . . . . . . . 34
28. Ягорачка . . . . . . . . . 35
29. Козачка . . . . . . . . . 36
30. Дакушная песьня . . . . . . . 37
31. Кветачкі . . . . . . . . . 38
32. Агарод . . . . . . . . . 40
33. Ледзяная гара . . . . . . . 41
34. Загадкі і адгадкі . . . . . . . 42
35. Жніво . . . . . . . . . 43
36. Восень . . . . . . . . . 46
37. Пагудачка . . . . . . . . 47
38. Шпак . . . . . . . . . 48
39. Май . . . . . . . . . . 49
40. Нашы птушкі . . . . . . . . 50



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

## ВЫШЛІ З ДРУКУ і ПРАДАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ НОТЫ:

| | | Цана |
|---|---|---|
| М. АЛАДАЎ — | „Бяспутнасьць“ — *Солё з акомпанімэнтам фортэп‘яна* . . . . . . | 5 кап. |
| „ | „Сасонка“ — *Солё з акомпанім. фортэп‘яна* | 5 „ |
| „ | „Лісты валяцца“ „ „ „ | 5 „ |
| „ | „З асеньніх напеваў“ „ „ | 10 „ |
| „ | „Замучаны цяжкай няволяй“ „ | 15 „ |
| „ | „Далінаю жыта“ „ „ | 20 „ |
| „ | „Ой, загуду, загуду“ — *Для мяшанага хору* | 20 „ |
| А. ГРЭЧАНІНАЎ — | „Ляцела зязюля“ — *Солё з акомпанімэнт. фортэп‘яна* . . . . . . | 18 „ |
| „ | „А ды ня пыл“. *Для мяшанага хору* . | 20 „ |
| „ | „Цяпер Купала“. „ „ „ . | 20 „ |
| М. ІПАЛІТАЎ-ІВАНОЎ. — | „Ой, ты бела бяроза“. *Солё з акомп. фортэп‘яна* . . . . . . | 18 „ |
| ЛУЦЭВІЧ і САВЁНАК. — | „Дашкольны сьпеўнік“, пад рэд. М. Мацісона. Для дзіцячых садоў і малодшых груп пачатковых школ, 57 песень . . | 70 „ |
| Л. МАРКЕВІЧ. — | „Жалобны марш на сьмерць У. І. Леніна“. *Для фортэп‘яна* . . . . . | 10 „ |
| М. МАЦІСОН. — | „Рэволюцыйныя песьні“. *Для мяш. хору*, Вып. I | 20 „ |
| „ | „ „ „ „ „ Вып. II | 25 „ |
| А. НІКОЛЬСКІ. — | „Дзе ты, хмелю, зімаваў“. *Для мяшанага хору* | 20 „ |
| „ | „А ў лесе, лесе“ „ „ „ | 20 „ |
| Я. ПРОХАРАЎ. — | „У мгле“. *Солё з акомп. фортэп‘яна* . | 10 „ |
| „ | „Зялёны дубочак“ „ „ . | 10 „ |
| „ | „Ах, ты, зорка мая“. *Для мяшанага хору* . | 20 „ |
| „ | „Ой рана ды па зары“ „ „ . | 18 „ |
| М. РАВЕНСКІ. — | „Прыляцелі гусі“. *Солё з акомп. фортэп‘яна* | 20 „ |
| „ | „Ня стой, каліна“.—*Для мяшанага хору* . | 20 „ |
| „ | „Як стаяла белая бяроза“ „ „ . | 20 „ |
| А. ТУРАНКОЎ. — | „Ой, з-пад лесу“ „ „ „ | 20 „ |

**„БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСЬНІ“** — *(сольныя і харавыя з акомпанім. фортэп‘яна)* у гармонізацыі М. АЛАДАВА, А. АЛЕНІНА, М. ІПАЛІТАВА-ІВАНОВА і Я. ПРОХАРАВА. 36 песень . . . . . . . . . . 60 „

**НОТЫ ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА і БЕЛКООПСАЮЗУ**

ЦАНА 1 РУБ.

857

1964

V2008г
B000000 14 12826